# Героі і эксперты

## Хто гэта і дзе шукаць такіх людзей

# Пытанні як ключавы інструмент журналіста

## Закрытыя

- На іх можна адказаць адным словам, звычайна «так» або «не».

☑️ Калі нам патрэбны дакладны, адназначны і кароткі адказ.

∈ Колькі вам гадоў?
∈ Вы нарадзіліся ў вёсцы?

## Адкрытыя

- Дапамагаюць атрымаць разгорнутыя адказы. Перадаюць пачуцці, меркаванні, уражанні і дэталі.
- Пачынаюцца з «што», «чаму», «навошта», «як», «раскажыце …».

☑️ Калі хочам атрымаць цытату, дэталі, індывідуальнае ўспрыманне.

∈ Чаму вы прыйшлі на сход?
∈ Раскажыце, чым вы займаліся, калі вам пазваніла Джоан Роўлінг?

## Удакладняючыя

- Дазваляюць упэўніцца, што правільна пачулі і зразумелі суразмоўцу.

☑️ Калі патрэбна толькі пацвярджэнне інфармацыі.

∈ Ці правільна я зразумеў, што на АЭС вы працавалі тры гады?

IFAE

# Тэхніка «варонка пытанняў»

Выкарыстоўваецца, калі неабходна атрымаць ад суразмоўцы як мага больш дэталяў, давер і максімальна поўную карціну падзеі. Тэхніка выкарыстоўваецца
ў продажах, пры следчых дзеяннях
і ў журналістыцы.




## Прыклад

Навошта выкарыстоўваць тэхніку?

– Ці былі вы на канцэрце «Гуртам» 20 жніўня?
– Так.
– Вы былі там увесь час, ад 20 да 23 гадзін?
– Так, была.
– Ці маглі б вы прыгадаць, якія гурты там выступалі выступалі?
– “Лейбонік”, “Пылай”, “Наві”
– Ого, якія зоркі! «Наві» выступалі першыя ці апошнія?
– Ого, якія зоркі! «Наві» выступалі першыя ці апошнія?
– Апошнія. Яны і праўда зоркі
– А якія касцюмы былі ў “Наві”?
– Арцём у касцюме з капелюшам, а Ксюша ў чырвонай сукенцы
– А што Вы адчувалі пасля іх выступлення?
– Я валілася з ног ад стомленасці, бо была двое сутак на дзяжурстве, але вельмі чакала менавіта іх. І не дарма, у мяне нібыта крылы з’явіліся! Ні развод, ні праблемы на рабоце, ні катастрофа з грашыма!
–

# Інтэрв'ю – жанр і метад

Метад: гутарка журналіста з суразмоўцам для падрыхтоўкі матэрыялу. Поспех інтэрв'ю залежыць ад падрыхтаванасці журналіста, а таксама ад умення слухаць і дакладна фармуляваць пытанні. Атрыманыя такім метадам адказы можна цытаваць і пакласці ў рамку артыкула, дзе будуць сабраныя вынікі іншых інтэрв'ю і працы з дадатковымі крыніцамі інфармацыі.

Жанр: тып журналісцкага кантэнту, пры якім пытанні журналіста чаргуюцца з адказамі суразмоўцы. Рэкамендуюць выкарыстоўваць толькі тады, калі журналіст выдатна падрыхтаваўся да гутаркі, у змесце будуць новыя факты і эмоцыі, а асоба суразмоўцы заслугоўвае пражэктара.

Па талоны прыходзьце ў пяць раніцы

Мы прыехалі на святое месца, дзе косці расстралянага бацькі

Нобель? Не, не чуў. Што адказвалі ў Маладзечне на пытанне: "Як вы ставіцеся да нобелеўскай прамовы Алексіевіч?"

# Эксперты

Групы грамадзянскай супольнасці:

1. Дзяржаўны (публічны)
2. Камерцыйны (прыватны)
3. Некамерцыйны (абарона правоў, дабрачыннасць, адукацыя, дапамога і падтрымка. Незалежныя ад першых двух)

Некамерцыйныя арганізацыі:

1. Экалагічныя (Экадом)
2. Праваабарончыя (Вясна)
3. Даследчыцкія (BEROC)
4. Адукацыйныя (IFAE, ТБШ)
5. Культурныя (СЭТ)
6. Дабрачынныя (Шанец)
7. Валанцёрскія (Анёл)

IFAE

# Як працаваць з экспертамі

- шукаць эксперта ў НКА
- рыхтавацца да размовы, а не спадзявацца, што за вас усё зробіць эксперт
- весці сваю базу кантактаў экспертаў і збіраць архіў дадзеных па тэмах, якія могуць спатрэбіцца ў будучым (табліца ў экселі)
- да эксперта можам ісці з пэўнай гіпотэзай, якую ён пацвярджае або абвяргае (Курс еўра рэзка ўпадзе ў студзені, а долар вырасце ў два разы)

# Як рыхтавацца да інтэрв'ю

1. Запішыце мэту матэрыялу. Для чаго гэты кантэнт вашаму выданню, асабіста вам і вашай аўдыторыі? (Напрыклад, тэкст пра самага рэйтынгавага сучаснага беларускага шахматыста)
2. Знайдзіце суразмоўцу. Ці хапае ў яго кампетэнцый і ці зможа ён даць сакавітыя дэталі?
3. Пашукайце інфармацыю пра тэму ў розных крыніцах
4. Падрыхтуйце пытанні да суразмоўцы і падумайце пра іх паслядоўнасць. Самае складанае і непрыемнае пакідайце на фінал, але пасля яго завяршыце гутарку чым-небудзь нейтральным
5. Дамоўцеся на сустрэчу або званок
6. Вядзіце запіс размовы
7. Не саромейцеся задаваць удакладняючыя пытанні, перапытваць, што не зразумелі
8. Не спяшайцеся і не бойцеся паўз. Няхай іх запаўняе суразмоўца